Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №3(54), Ч2, 2009

*УДК 398.3:551.5(=161.3)(476.4)*

# Метэаралагічныя народныя прыкметы Магілёўшчыны

А. М. НЕНАДАВЕЦ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Так атрымалася, што адзін з самых распаўсюджаных і шырокаўжывальных жанраў беларускага фальклору – прыкметы – так амаль і недаследаваныя да нашых дзён. Калі і звярталі на іх увагу, то, найперш, толькі з мэтай запісу, фіксавання, а вось да глыбокага тэарэтычнага аналізу справа зусім не даходзіла (Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, У. Васілевіч). Аналітычнае асэнсаванне чакае сваіх удумлівых даследчыкаў (праўда, Гомельскаму рэгіёну пашанцавала болей, бо там у гэтым накірунку плённа працуе ў апошнія гады А. Кастрыца). А вось Магілёўшчына па-ранейшаму застаецца "белай плямінай" на карце фальклорных маршрутаў.

Чалавек мінуўшчыны заўсёды адчуваў сябе ў непаўторнай сувязі з прыродай, адухаўляў яе саму, персаніфікаваў прыродныя стыхіі, лічыў іх усемагутнымі і ўсёпаглынаючымі ў нейкім глабальным плане, які сам далёка не заўсёды мог растлумачыць ці нават і ўявіць. Губляючыся ў гэтай празмернай глабальнасці, уяўляючы сябе на дзіва дробным, слабым, у параўнанні з тымі праявамі, якія яму даводзілася бачыць і адчуваць, продак, тым не меней, імкнуўся любым чынам знайсці нейкае выйсце, а яно магло атаясамлівацца са спробамі змяншэння стыхійнай магутнасці, своеасаблівай псіхалагічнай падрыхтоўкі да той страшнай хвіліны, калі разгуляецца віхор, навальніца, завея, залева, з упарадкаваннем цэлай сістэмы прыкмет і павер'яў, сфарміраваных у працэсе шматвяковых назіранняў. Вядома ж, сама гэтая сістэма грунтавалася яшчэ і на рэлігійных перакананнях, была хітра прымеркавана да гадавых біблейскіх святаў, нават да "чыста" гаспадарчага працэсу варажбы. Вяскоўцу ўсё абавязкова мроілася ў сувязі з надзеяй на плоднасць жывёлы, добры ўраджай, захаванне здароўя і дабрабыту членаў сваёй сям'і, рода ("радзіны"). Немалаважным было і тое, якое надвор'е "стане" спрыяць у той ці іншы перыяд. Тут неабходна адзначыць: народныя прыкметы адрозніваюцца празмеранай разнастайнасцю. Даводзіцца толькі здзіўляцца, як усё гэта магло заўважаць і фіксаваць дапытлівае вока патрыярхальнага продка. Пачнем са спробаў прадказання надвор'я.

Любому карпатліваму селяніну хацелася заранёй усё ведаць, каб быць гатовым да нейкіх пільных патрэб, нечаканых змен. Ішло ўсё з самага простага: "Дровы ў печцы з трэскам згараюць – на мароз, а калі сквірчаць, дымяць, не загараюцца – на адлігу"; "Галкі і вароны на снег садзяцца – адлігу чуюць, а лятаюць і крычаць – снегапад чуюць"; "Верабей ціўкае ў абед ў паўднёвы бок – на цяпло, а ў паўночны – на халады" (в. Добрая, Горацкага раёна, Магілёўскай вобласці, ад Марозавай Г.І., 1930 г.н.; у далейшым будуць падавацца толькі вёска і раён); "Снягір пад вакном чырыкае – да адлігі"; "Вароны і галкі садзяцца на поўдзень насамі – да цяпла, на ўсход – да холаду"; "Варона ходзіць па дарозе – да цяпла"; "Дзяцел дзяўбе ў сцяну, дык мяцеліца будзе"; "Калі ластаўкі пачынаюць лётаць вельмі нізенька над зямлёй, то можна сказаць, што будзе дождж, ці пачнецца непагадзь" (в. Абраімаўка, Дрыбінскага раёна, ад П'янусавай Н.Я., 1920 г.н.).

"Кароткатэрміновыя" прыкметы былі яскравым сведчаннем таго, што людзі, хутчэй за ўсё, не проста з-за цікаўнасці імкнуліся даведацца, якое ж будзе надвор'е назаўтра, але яшчэ і таму, што трэба было выпраўляцца на працу самому, адправіць жонку, дзяцей, адным словам, "правільна спланаваць дзень, каб ён не прапаў задарма". Хоць, паводле хрысціянскай традыцыі, ніколі не праміналі падкрэсліць, што "ў Бога дзён многа, на наш век хопіць".

Існавала і іншая група прыкмет, якія давалі ўяўленні (ці спадзяванні) аб тым, якое надвор'е прыспее праз месяц, паўгода, год. Далей зазіраць у сваіх прадказаннях асабліва не імкнуліся: "Далей года гадаць, то не наш розум, то божая справа", – пацвярджалася далёка не адным інфарматарам: "Зіма снежная – лета дажджлівае"; "Зімой суха і холадна – летам суха і

цёпла"; "Калі зімой іней – летам раса"; "Прываліць снег у снежні ўшчэнт да плоту – дрэннае лета; застанецца прамежак – ураджайным будзе лета"; "Як у лютым аукнецца, так восенню і адгукнецца"; "Люты халодны і сухі – жнівень цёплы"; "Частыя туманы ў сакавіку гавораць аб тым, што лета будзе дажджлівае"; "Май халодны – год хлебародны"; "Вясной дождж парыць, восенню – мочыць"; "Калі ў студзені дажджы, дабра не жджы" (в. Міхалёва, Магілёўскага раёна, ад Цітовай В.Дз., 1929 г.н.); "Зіма снежная – лета дажджлівае"; "Студзень мяце – ліпень залье"; "Калі ў лютым трываюць пастаянныя маразы, лета гарачае" (в. Благавічы, Чавускага раёна, ад Леснікоўскай М.Ф., 1928 г.н.).

Часам сустракаюцца даволі абагуленыя прыкметы, паводле якіх так і нельга было здагадацца, якім жа будзе, напрыклад, надвор'е ў канкрэтны дзень ці перыяд: "Гарачае лета звычайна змяняецца мокраю і халоднаю восенню, у якую будзе столькі халадоў і дажджоў, колькі іх можа быць летам"; "Калі гром вясной рана прагрыміць, няма яшчэ на дзярэўях ні лісточка, то што-та ў гэтым годзе случыцца плахое ў прыродзе (павадак, пажар, засуха)"; "Можна сказаць, што непагадзь будзе працяглай, калі вецер не моцны, але ж дуе ён пастаянна, асабліва, калі з поўначы"; "Калі гром грыміць яшчэ ў верасні, то гавораць, што восень будзе, напэўна, доўгая, зацяжная"; "Калі гэтае лета было вільготнае, мокрае, а восень была цёплая, то тады гавораць, што зіма павінна быць доўгай"; "Перад працяглай непагаддзю яшчэ гавораць і такое: далёка лес бачыць можна добра і выразна, а далёкія гукі выразна чуваць" (г. Горкі, ад Дварэцкай Н.І., 1926 г.н.).

Вельмі ўважліва сачылі далёкія продкі за тым, як паводзіла сябе сонца. Нябеснае свяціла, што з'яўлялася крыніцай жыцця і ўсяго жывога на зямлі, заўсёды лічылася свяшчэнным, адухоўленым, абагаўлёным. Таму найбольш часта ў прыкметах заўважаюцца самыя дробязныя адхіленні ад звычайнай прыроднай стыхійнасці: "Калі сонца заходзе летам і на небе вельмі шмат хмар, то можна сказаць, што назаўтра будзе дрэннае надвор'е"; "Калі ж пры захадзе сонца неба чыстае, то пагода назаўтра можа быць добрая".; "Калі ж дождж заціх і бачнасць наогул добрая, то непагадзь можа быць занадта доўгай"; "Калі сонца пасля ўсходу свайго схаваецца, то гавораць, што трэба чакаць дажджу"; "Калі раптам пойдзе "сляпы" дождж, то тады гавораць, што яшчэ доўга будзе непагода"; "Добрае надвор'е чакай, калі сонца ў "ваду сядзе" (г. Горкі , ад Дварэцкай Н.І., 1926 г.н.).

Многія з павер'яў звязаны з лесам, дрэвамі, нават з іхнім сокам, лістотай, шышкамі і г.д.: "Мокры год будзе, калі вольха раней распусцілася за бярозу"; "Калі на елцы шышкі стануць красныя, а на сасне зялёныя – сей ячмень"; "Калі бяроза перад вольхай ліст распусціць, то лета будзе сухое; калі вольха наперад – мокрае"; "Калі бярозавы сок цячэ добра, то лета будзе дажджлівае. А калі слаба – сухое"; "Калі ўвосень лісце бяроз пачынае жаўцець з верху, то наступная вясна павінна быць ранняй, а калі наадварот, то вясна будзе позняй" (в. Шалаханаўка, Горацкага раёна, ад Котавай Н.В., 1920 г.н.); "Калі з усіх дрэў лісце будзе ападаць амаль разам ("дружна"), то можна гаварыць аб "злой" зіме"; "Калі з бяроз і дубоў лісце ўвосень ападае не поўнасцю, то трэба таксама чакаць "злой" зімы. Пакуль лісце з вішні (восенню) не апала, колькі снегу не выпала, адліга яго ўсё роўна зліжа"; "Ядраная рабіна – будзе восень гразі і па аглабліну"; "Калі ў лесе вельмі шмат рабіны, то можна чакаць дажджоў увосень, калі ж няшмат , то восень, напэўна, будзе сухаватая" (в. Вендрыж, Магілёўскага раёна, ад Адамчук Н.М., 1925 г.н.).

Імкнуліся людзі заўважаць і тое, як паводзілі сябе ў акрэсленыя дні пчолы, мурашкі, птушкі, звяры, жывёлы і па гэтым меркавалі, якое ж надвор'е прыспее неўзабаве ці і на працягу даволі значнага перыяду. "Калі ў красавіку пчолы не вылецелі – чакай халадоў; Калі шмат пчол на ноч не залятаюць у вулей, трэба чакаць перамены цёплага надвор'я на дажджлівае. Калі пчолы вылятаюць на работу раней звычайнага, то, нягледзячы на ясную пагоду, пад вечар усё ж збярэцца дождж"; "Калі зязюля закукуе на голым дзераве, то будзе голад"; "Гусі адлятаюць у вырай – зіму на хвастах цягнуць"; "У верасні сініца просіць восень у госці"; "Калі паляўкі" (палявыя мышы) будуюць свае гнёзды вышэй зямлі летам – між сцяблінамі жыта, травы, куста, то лета будзе мокрае, і чым вышэй гнёзды, тым горш зіма, якая неўзабаве надыйдзе, будзе снежная. Але калі яны будуюць гнёзды пераважна ў зямлі, то зіма будзе без снегу"; "Калі дзікія качкі робяць свае гнёзды ля самай вады, то наступнае лета будзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

больш мокрае. Калі дзікая качка апынецца ў пуні, трэба чакаць вялікай спякоты" (в. Абраімаўка, Дрыбінскага раёна, ад П'янусавай Н.Я., 1920 г.н.).

Асабліва часта прывязвалі ўсемагчымыя прыкметы ў беларускім народзе да розных святаў. Гэтая асаблівасць характарызуецца даследчыкамі, як своеасаблівы народны каляндар. "Калі на Крашчэнне ідзе снег, год будзе ўраджайны і будзе многа грыбоў"; "Калі на стары Новы год ідзе снег ці ёсць ізмаразь на дрэвах, год будзе ўраджайным. Калі не ідзе снег і няма ізмаразі, тады неўраджайны"; "Калі снег вялікі ляжыць на Вадохрышча, то ў гэтым годзе шчодра стануць раіцца пчолы, а бульба ўродзіць вялікая і будзе яе многа; Калі ж напярэдадні выпала зорная ноч, налета тады ўродзяць усе ягады (у лесе, у балоце і ў садзе), высыплюць яны гусценька, а гарох удасца буйны і, што немалаважна, не чарвівы; калі пахмурна ў гэты дзень, хмары набрынялыя нізка па небу плывуць, ці на месцы "завіслі-стаяць", то гэта вельмі добры знак, бо зернавыя вырастуць сцяною і дадуць спорны ўраджай, а калі хмары высока ідуць і яны светлыя, то і ўраджай не ўдасца; а яшчэ насыпле шмат снегу, то, зноў жа, – гэта прадказанне добрага росту хлебнай нівы, але затое капусты на восень гаспадыні і чакаць няма чаго, бо яе дазвання вусені з'ядуць – паталочаць; яшчэ не забываліся адзначыць, што калі на Вадохрышча завіруха ўсходзіцца, то такая ж самая будзе потым і на Вялікдзень; калі на Вадохрышча мароз трашчыць – страляе, то на Вялікдзень стане невыносна горача, нягледзячы на параўнаўча раннюю пару". "На Стрэчанне зіма з вясной сустракаецца. У гэты дзень глядзяць пагоду на ўсю вясну. Мяцель паказвае доўгую вясну, мароз – раннюю вясну. Кагда пагода харошая, свеціць сонца і капае з крыш, то год будзе ўраджайным"; "Калі на Стрэчанне пад нагамі перастаў скрыпець снег і вецер падуў з поўдня – чакаецца цяпло"; "Калі на Стрэчанне замерзлыя вокны паволі сталі раставаць, то назаўтра будзе пацяпленне"; "На святога Ананаса ("гусінае свята"), 31 студзеня на Магілёўшчыне звычайна сцвярджалі, што ўжо прайшла палова зімы. Гаспадары ўважліва глядзелі на запасы корму для жывёлы і меркавалі, што калі яго засталася палавіна, то жывёла выжыве да вясны, калі яе трэба будзе выганяць на пашу: "Засталося ў цябе, пане-гаспадару, паўстога, то падзякуй Бога, а калі пустая адрына, то хутка надыйдзе ліхая часіна". Праўда, зафіксаваны і іншыя прыклады, у якіх "паловай" зімы лічацца Грамніцы. Так і казалі спрактыкаваныя людзі: "Грамніцы – зімы палавіцы". І нібы пацвярджаючы, што зіма паверне "на цёплы бок", дадавалі: "Да грамніц ніколі, чалавеча, не скідай рукавіц, а калі мінулі Грамніцы, то тады табе ўжо не трэба рукавіцы"; "На Мацея дарога пацее, на Саракі дрэвы ачышчаюцца, на Аляксея рыба хвастом лёд ламае, а на Благавешчанне – бусел прылятае" (в. Забычанне, Касцюковіцкага раёна, ад Ціцянковай М.І., 1918 г.н.).

На дзень Паўрацення (па-іншаму яго называлі Янам) "вопытныя пчаляры меркавалі на паводзінах пчол, якое будзе надвор'е. Калі заўважалі, што пчолы рухаюцца, "ажылі", то казалі, што і лета будзе цёплае, сонечнае, спрыяльнае пчолкам для збору мёду"; "Калі пчолы на вясенняга Яна (9-га сакавіка) паціху ажываюць і шавеляцца ў вулеях, то іхні гаспадар ведае, якое наперадзе чакаецца лета. Паводзіны пчол прадказвалі ні што іншае, як цяпло і спрыяльнае надвор'е для росту збажыны, пладнасці ўсяго жывога"; "Калі на Паўраценне пчала ў вулеі з боку на бок пераварочваецца, то яна і сонца на летні бок варочае. Цяпер ужо ўсе цяпла чакаюць, не звяртаючы асаблівай увагі на кароткачасовыя прымарозкі"; "Пчолы ў вулеях павінны на Паўраценне ажываць паціху. Калі так адбываецца, то чалавек заўсёды радуецца. Таму, што яны жывыя, а яшчэ і таму, што паказваюць на цёплае лета"; "Хто пчол ведае, той па іх паводзінах яшчэ зімою можа сказаць, якое будзе лета. Дастаткова такому чалавеку глянуць, як яны паварочваюцца на зімовага Яна і ўсё на тым. Калі хоць адна пчала на ягоных вачах павернецца, то, значыцца, лета будзе цёплае, ва ўсім чыста спрыяльнае". (в. Салтанаўка Магілёўскага раёна, ад Зімянінай С.І., 1915 г.н.).

Можна было сустрэць і такое: "Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я напасецца вол травіцы; Як на Стрэчанне божае раным-раненька ўзыходзіць сонца, то будзе ранні лён, калі снег перамятае езджую дарогу, то чакаецца надта ж позняя ды яшчэ і зацяжная вясна, без цяпла і цёплых дажджоў, што нічога расці не будзе"; "Калі на памінальным (Дзедавым) тыдні вялікая завея была ў нядзелю, то тады авёс найлепей сеяць на дзевятым тыдні; калі ж у панядзелак, то на восьмым; а калі ў сераду і чацвер, то пакідалі "дзесяцінкі дзве". А яшчэ глядзелі, калі на гэтым тыдні ў які іншы дзень адбывалася вялікая завея, то та-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ды выпадала сеяць авёс раней звычайнага”; “На святога Аляксея вол павінен вады з лужы напіцца. Верылі, што першыя буслы з’явяцца ў гэты дзень з далёкага выраю: “На Аляксея, хоць пакалечуся – паб’юся, але ж у роднае гняздо вярнуся”; “на святога Аляксея лёд ужо такі тонкі, што і рыба хвастом разаб’е”; “Аляксей восці асаджае, лодкі асмаляе, а рыбу коле”; “На весняга Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою лезе”; “На Яна любілі паўтараць: “Калі выйдзе рой перад Янам, то стане гаспадар панам”; “Калі не выліняў конь да Яна, то няхай ён ідзець да другога пана”; “Пра прысвятак Анапрэя ў нас некалі гаманілі: “Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ”; Лічылі, што да гэтага дня ўжо паспелі суніцы і адзначалі: “Калі суніца красна, то не сей аўсу напрасна, бо ўжо не паспее” (в. Княжыцы, Магілёўскага раёна, ад Камковай Н.П., 1920 г.н.); “Калі толькі на Міхала (26 верасня) будзе стаяць ясная ноч, то гэта азначае, што надыдзе трывалая зіма. Яшчэ падкрэслівалі, што калі ў гэтую ноч вецер дзьме з поўначы (“сіверны”), дык не спадзявайся на добрае надвор’е”; “Святы Міхал на ўсю зіму надвор’е ўказвае: калі на небе высыплюць зоркі і ноч ясная ды яшчэ і з паўночныя ветрам, то, як казалі старыя людзі, неабходна чакаць суровай зімы, з моцнымі траскучымі маразамі”.

Часам прыкметы здзіўлялі не толькі сваёй празмернай назіральнасцю, але яшчэ і тым, як у іх тлумачыліся паводзіны хатніх жывёл. На іх ужо продкам ставала часу і наглядзецца, і ўсё чыста зафіксаваць: “Кот шкрабе падлогу – на вецер, крэпка спіць – да цяпла”; “Сабака на снезе валяецца – да дажджу ці да снегу”; “Калі капыты ў коней пацеюць, то гэта няйначай, як да цяпла”; “Стада к вечару разраўлося – будзе дажджлівае надвор’е”; “Кошка на печы – да сцюжы, на палу – да цяпла”; “Кот на двор без прычыны прэцца, то на хуткі час цяпло падыйдзе”; “Сабака лапамі шкрабецца на поўнач, то пэўна снег ці дождж чуе”; “Кот мяўкае і ад акна не адыходзіць, трэба чакаць мяцеліцу”; “Кот за комін шыецца – вялікую буру прадчувае”; “Конь капытамі ў замёрзлую зямлю стукае – адчувае, што недзе вясна пачалася”; “Коні іржуць, адзін аднаго пераклікаюць – змену надвор’я чуюць”; “Кот мяўкае і да вакна падскоквае, – баіцца таго, што неўзабаве на дварэ страшная навальніца ці завіруха пачнецца”; “Калі кошка малых кацянят на печ ці ў падплечак заганяе, дык чакай таго, што непагадзь усходзіцца, яна гэта і адчувае”; “Кот ад дзвярэй не адходзіць, гаспадар павінен ведаць, што ў двары трэба пазачыняць усе дзверы, бо распачнецца снегапад ці вялікі дождж” (в. Салтанаўка, Магілёўскага раёна, ад Змітраковай Д.Г., 1918 г.н.).

Такім чынам, можна адзначыць наступнае: на першае месца ў народных прыкметах заўсёды выступала празмерна-ўражлівая назіральнасць продкаў, якія, нягледзячы на пастаянную занятасць цяжкай фізічнай працай, умелі “адфільтраваць” з вялізнай колькасці народных сведчанняў тыя прыклады, што на самой справе дапамагалі ім прадбачыць надвор’е на пэўны перыяд: даволі працяглы (гадавы цыкл) і на кароткі адрэзак часу (дзень, тыдзень, месяц, квадру). Па-другое, прыкметы грунтаваліся не на нейкіх там адцягнутых абстрактна-філасофскіх паняццях і заключэннях, а на самых, што ні на ёсць, будзённых справах, праявах прыродных стыхій, паводзінах птушак, звяроў і жывёл. Па-трэцяе, старадаўнія людзі ніколі не забываліся звяртаць сваю ўвагу на дрэвы, кустоўе, кветкі, траву і многае іншае, што таксама заўсёды чуйна рэагавала на змены ў прыродзе і магло засцерагчы ад нечаканых прыродных катаклізмаў ці кароткачасовых дажджоў, маразоў або снегападаў.

**Abstract.** The paper analyses meteorological superstitions of Mogilev region. It is emphasized that our ancestors paid special attention to the behaviour of animals, beasts, and birds alongside with heavenly bodies.

Бобруйский филиал Белорусского государственного экономического университета

Поступило 16.06.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ